ДАДАТАК
ПРИЛОЖЕНИЕ

Гэтым сведчым,

Што, міласцю Божай, завершана ўзнаўленне ўзвіжальнага Крыжа найпадобнейшай маці нашай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай, зробленага з яе багаславення ў 1161 годзе ад Нараджэння Хрыстовага майстрам Лазарам Богшам.

На працягу пяці гадоў — ад дзён святкавання 1000-годдзя Полацкай епархіі і Праваслаўнай Царквы на Белай Русі ў 1992 годзе і да сённяшняга дня — доўжылася праца па адраджэнні святыні.

Гэты Святы Крыж, зроблены ў Брэсце майстрам М. П. Кузьмічом у старажытнавізантыйскай тэхніцы перагародкавай эмалі, як і старажытны, захоўвае ў сабе часцінкі Крыві Хрыстовай, Каменя ад Труны Гасподняй, Каменя ад Труны Найсвяцейшае Багародзіцы, Святога і Жыватворнага Крыжа; часцінкі святых мошчаў архідыякана першамучаніка Стэфана, велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага, велікамучаніка і лекара Панцялеймана.

Адраджэнне святыні, якая шануецца ва ўсім Праваслаўным свеце і асабліва ахоўвае Белую Русь, сталася справаю ісцінна ўсенароднаю. У ёй — наша пакаянне, наша вера, надзея і любоў да Бога і Бацькаўшчыны.

Няхай памяне нас Гасподзь у Царстве Сваім сёння, і заўсёды, і на векі вечныя. Амінь.

Сінод Беларускай Праваслаўнай Царквы
26–27 верасня 1997 года.
Узвіжанне Святога і Жыватворнага Крыжа Гасподняга.
Брэст—Мінск—Полацк.

Сим свидетельствуем,

Что, милостию Божией, завершено воссоздание воздвизального Креста

преподобной матери нашей Евфросинии, игумении Полоцкой, изготовленного по ее благословению в 1161 году от Рождества Христова мастером Лазарем Богшей.

В течение пяти лет — от дней празднования 1000-летия Полоцкой епархии и Православной Церкви на Белой Руси в 1992 году и до нынешнего дня — продолжались труды по возрождению святыни.

Сей Святый Крест, изготовленный в Бресте мастером Н. П. Кузьмичом в древневизантийской технике перегородчатой эмали, как и древний, хранит в себе частицы Крови Христовой, Камня от Гроба Господня, Камня от Гроба Пресвятыя Богородицы, Честнаго и Животворящаго Креста; частицы святых мощей архидиакона первомученика Стефана, великомученика Димитрия Солунского, великомученика и целителя Пантелеимона.

Возрождение святыни, почитаемой во всем Православном мире и особо покровительствующей Белой Руси, стало делом воистину всенародным. В нем — наше покаяние, наша вера, надежда и любовь к Богу и Отечеству.

Да помянет нас Господь во Царствии Своем
всегда, ныне и присно и во веки веков. Аминь.

Синод Белорусской Православной Церкви
26–27 сентября 1997 года.
Воздвижение Святого и Животворящаго Креста Господня.
Брест—Минск—Полоцк.

ПАСТАНОВА
Першага сходу беларусаў блізкага замежжа

1. Сход падтрымлівае выказаную ў выступленнях дэлегатаў прапанову аб аднаўленні вобраза гістарычнай і духоўнай рэліквіі беларускага народа — Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай, страчанага падчас Другой сусветнай вайны.

2. Сход даручае Управе ЗБС «Бацькаўшчына» ажыццявіць практычную рэалізацыю прапановы і забяспечыць выкананне працы да Першага з'езду беларусаў свету ўлетку 1993 года.

г. Мінск, 20 снежня 1992 г.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ
Первого схода белорусов близкого зарубежья

1. Сход поддерживает высказанное в выступлениях делегатов предло-

жение о воссоздании образа исторической и духовной реликвии белорусского народа — Креста святой Евфросинии Полоцкой, утраченного во время Второй мировой войны.

2. Сход поручает Управе ОБМ «Бацькаўшчына» осуществить практическую реализацию предложения и обеспечить выполнение работы к Первому съезду белорусов мира летом 1993 года.

г. Минск, 20 декабря 1992 г.

НАВУКОВА-ГРАМАДСКАЯ РАДА
па аднаўленні вобраза Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай, які выконваецца на заказ Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына»

Аляксееў Леанід — доктар гістарычных навук (Масква)

Арлоў Уладзімір — пісьменнік, гісторык

Біч Міхаіл — намеснік дырэктара Інстытута гісторыі АН РБ

Бубноўскі Дзмітрый — старшыня Дзяржінспекцыі па ахове гістарычна-культурнай спадчыны

Буралкін Генадзь — старшыня Саюза мастакоў Беларусі

Бутэвіч Анатоль — міністр культуры і друку

Высоцкая Надзея — дацэнт кафедры крыніцазнаўства і мастацтвазнаўства Беларускай акадэміі мастацтваў

Ганецкая Ірына — навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН РБ

Гарэцкі Радзім — прэзідэнт ЗБС «Бацькаўшчына», віцэ-прэзідэнт АН РБ

Гілевіч Ніл — старшыня камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны

Гілеп Уладзімір — намеснік міністра культуры і друку

Жыльскі Аляксей — старшыня Савета па справах рэлігій пры СМ РБ

Загорская Ніна — супрацоўнік Міністэрства культуры і друку, намеснік старшыні Рады ЗБС па канфесійных пытаннях

Касцюк Міхаіл — дырэктар Інстытута гісторыі АН РБ

Коўтун Валянціна — старшыня Міжнароднага жаночага фонду св. Еўфрасінні Полацкай

Краўчанка Пётр — міністр замежных спраў

Кулік Яўген — мастак

Купава Мікола — мастак

Лавіцкі Генадзь — старшыня КДБ

Макарава Таццяна — доктар гістарычных навук (Масква)

Мальдзіс Адам — дырэктар Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф.Скарыны

Саверчанка Іван — навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры АН РБ

Сілівончык Анатоль — намеснік старшыні Рады прадпрымальнікаў беларускага замежжа (Сургут)

Скрыпчанка Таццяна — навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН РБ

Стук Барыс — прэзідэнт Рады прадпрымальнікаў беларускага замежжа, намеснік старшыні Рады ЗБС па эканамічных пытаннях

Сурмач Ганна — старшыня Рады ЗБС «Бацькаўшчына»

Тарасаў Сяргей — навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН РБ

Філарэт — мітрапаліт Менскі і Слуцкі, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі

Хадыка Юры — доктар фізіка-матэматычных навук, заг. лабараторыі Інстытута фізікі АН РБ

Чарняўскі Ігар — першы намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры СМ РБ

Чарняўскі Міхась — заг. аддзела Інстытута гісторыі АН РБ

Шавялевіч Віктар — кінарэжысёр

Шматаў Віктар — дырэктар Музея старажытнай беларускай культуры

Штыхаў Георгі — доктар гістарычных навук, заг. аддзела Інстытута гісторыі АН РБ

Зацверджана на пасяджэнні Управы ЗБС «Бацькаўшчына»
15.03.1994 г.

НАУЧНО-ОБЩЕСТВЕННЫЙ СОВЕТ по воссозданию образа Креста святой Евфросинии Полоцкой, который выполняется по заказу Объединения белорусов мира «Бацькаўшчына»

Алексеев Леонид — доктор исторических наук (Москва)

Бич Михаил — заместитель директора Института истории АН РБ

Бубновский Дмитрий — председатель Госинспекции по охране историко-культурного наследия

Буралкин Геннадий — председатель Союза художников Беларуси

Бутевич Анатолий — министр культуры и печати

Высоцкая Надежда — доцент кафедры источниковедения и искусствоведения Белорусской академии художеств

Гилевич Нил — председатель комиссии Верховного Совета по образованию, культуре и сохранению исторического наследия

Гилеп Владимир — заместитель министра культуры и печати

Гонецкая Ирина — научный сотрудник Института истории АН РБ

Горецкий Радим — президент ОБМ «Бацькаўшчына», вице-президент АН РБ

Жильский Алексей — председатель Совета по делам религий при СМ РБ

Загорская Нина — сотрудник Министерства культуры и печати, заместитель председателя Рады ОБМ по конфессионным вопросам

Ковтун Валентина — председатель Международного женского фонда св. Евфросинии Полоцкой

Костюк Михаил — директор Института истории АН РБ

Кравченко Петр — министр иностранных дел

Кулик Евген — художник

Купава Микола — художник

Лавицкий Геннадий — председатель КГБ

Макарова Татьяна — доктор исторических наук (Москва)

Мальдис Адам — директор Национального научно-просветительского центра имени Ф. Скорины

Орлов Владимир — писатель, историк

Саверченко Иван — научный сотрудник Института литературы АН РБ

Силивончик Анатолий — заместитель председателя Рады предпринимателей белорусского зарубежья (Сургут)

Скрипченко Татьяна — научный сотрудник Института истории АН РБ

Стук Борис — президент Рады предпринимателей белорусского зарубежья, заместитель председателя Рады ОБМ по экономическим вопросам

Сурмач Ганна — председатель Рады ОБМ «Бацькаўшчына»

Тарасов Сергей — научный сотрудник Института истории АН РБ

Филарет — митрополит Минский и Слуцкий, Патриарший экзарх всея Беларуси

Хадыка Юрий — доктор физико-математических наук, зав. лабораторией Института физики АН РБ

Чернявский Игорь — первый заместитель начальника Главного управления реставрациии и консервации памятников истории и культуры при СМ РБ

Чернявский Михась — зав. отделом Института истории АН РБ

Шевелевич Виктор — кинорежиссер

Шматов Виктор — директор Музея древней белорусской культуры

Штыхов Георгий — доктор исторических наук, зав. отделом Института истории АН РБ

Утверждено на заседании Управы ОБМ «Бацькаўшчына»
15.03.1994 г.

РАШЭННЕ
Навукова-грамадскай рады пры Згуртаванні беларусаў свету «Бацькаўшчына» па стварэнні Крыжа на ўзор узвіжальнага Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай

У адпаведнасці з дамоваю ад 29.01.1993 і пратаколам ад 10.02.1994 мастаком Міколам Кузьмічом па заказу ЗБС «Бацькаўшчына» была распачатая праца па аднаўленні Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай. На працягу больш як паўтара года майстрам была праведзеная вялікая навукова-пошукавая работа па аднаўленні страчаных элементаў Крыжа, узнаўленні тэхнікі выканання гэтай рэліквіі, зроблены апісанне і эскізы Крыжа.

На падставе пададзеных мастаком выніковых матэрыялаў Рада прыняла рашэнне:

I. Зацвердзіць вынікі навукова-пошукавай працы мастака Міколы Кузьміча па аднаўленні Крыжа Еўфрасінні Полацкай у яго першапачатковым выглядзе з ідэнтычнай дакладнасцю і ў строгай адпаведнасці з апісаннямі, слайдамі і іншымі матэрыяламі, якія захаваліся на сённяшні час, з узнаўленнем страчаных месцаў па аналагах XII стагоддзя.

II. Скіраваць намаганні на пошук арыгінала Крыжа Еўфрасінні Полацкай, стварыўшы рабочую групу з удзелам прадстаўнікоў ЗБС «Бацькаўшчына», Царквы, Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны, Міністэрства замежных спраў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі.

III. Унесці змены ў тэрміналогію:

1. Зацвердзіць назву новай рэліквіі:

«Крыж па вобразу і падабенству ўзвіжальнага Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай»

2. Працэс працы называць:

«Стварэнне Крыжа па вобразу і падабенству ўзвіжальнага Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай»

IV. Рэкамендаваць кіраўніцтву ЗБС «Бацькаўшчына» зацвердзіць пададзеныя мастаком эскіз і апісанне Крыжа і на іх падставе пачаць выкананне работы ў матэрыяле.

4.07.1994

РЕШЕНИЕ
Научно-общественного совета при Объединении белорусов мира «Бацькаўшчына» по созданию Креста по образцу воздвизального Креста святой Евфросинии Полоцкой

В соответствии с договором от 29.01.1993 и протоколом от 10.02.1994 художником Миколой Кузьмичом по заказу ОБМ «Бацькаўшчына» был начат труд по восстановлению Креста святой Евфросинии Полоцкой. На протяжении более чем полутора лет мастером была проведена большая научно-поисковая работа по восстановлению утраченных элементов Креста, воссозданию техники исполнения этой реликвии, сделаны описание и эскизы Креста.

На основании представленных художником итоговых материалов Совет принял решение:

I. Утвердить итоги научно-поисковой работы художника Миколы Кузьмича по воссозданию Креста Евфросинии Полоцкой в его первоначальном виде с идентичной точностью и в строгом соответствии с описаниями, слайдами и другими сохранившимися до нынешнего времени материалами, с восстановлением утраченных мест по аналогам XII века.

II. Направить усилия на поиск оригинала Креста Евфросинии Полоцкой, создав рабочую группу с участием представителей ОБМ «Бацькаўшчына», Церкви, Национального научно-просветительского центра имени Ф. Скорины, Министерства иностранных дел, Комитета государственной безопасности.

III. Внести изменения в терминологию:

1. Утвердить название новой реликвии:

«Крест по образу и подобию воздвизального Креста святой Евфросинии Полоцкой».

2. Процесс работы называть:

«Создание Креста по образу и подобию воздвизального Креста святой Евфросинии Полоцкой».

IV. Рекомендовать руководству ОБМ «Бацькаўшчына» утвердить представленные художником эскиз и описание Креста и на их основе приступить к исполнению работы в материале.

14.07.1994.

KAMUNIKA.org

ЗАЯВА
Рады Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» ў сувязі з узнаўленнем вобраза Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай

Вяртанне Беларусі яе нацыянальных скарбаў з'яўляецца адным з галоўных накірункаў дзейнасці Згуртавання беларусаў свету (ЗБС) «Бацькаўшчына». Асаблівае месца ў гэтай працы займае клопат пра лёс створанага ў 1161 годзе полацкім майстрам Лазарам Богшам Крыжа святой Еўфрасінні — старажытнага сімвала святасці і дзяржаўнасці нашай зямлі, страчанага ў гады Другой сусветнай вайны. Відавочна, што страта Крыжа — гэта не матэрыяльная згуба. Крыж пайшоў ад нас таму, што мы адышлі ад Боскіх запаветаў, ад святых абавязкаў захоўваць свой род, сваю краіну, яе культуру і мову — усё тое, што дадзена нам Усявышнім.

У час новага беларускага Адраджэння пачаўся наш шлях вяртання да святыняў. З Божай ласкі і дзякуючы змаганню лепшых сыноў Беларусі наш народ пачаў абуджацца ад гістарычнага бяспамяцтва. Менавіта тады і ўзнікла ідэя аднаўлення вобраза гістарычнай рэліквіі — Крыжа Еўфрасінні. У снежні 1992 года на Першым сходзе беларусаў блізкага замежжа была падтрыманая прапанова аб сімвалічным вяртанні святыні і стварэнні Крыжа па вобразу і падабенству Жыватворнага Крыжа Еўфрасінні. Арганізатарам Сходу была грамадская арганізацыя — Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». Менавіта «Бацькаўшчына» і ўзяла на сябе высакародны і няпросты абавязак выканаць волю беларускай грамады. Адказным за гэтую справу быў прызначаны прадпрымальнік беларускага паходжання з Расіі (Сургут) Анатоль Сілівончык.

Выкананне гэтага надзвычай адказнага і складанага заказу «Бацькаўшчына» даручыла вядомаму беларускаму мастаку-ювеліру Міколу Кузьмічу. Распачатая праца атрымала багаславенне мітрапаліта Менскага і Слуцкага, Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі Філарэта. Беларускі экзархат узяў на сябе духоўную апеку над справаю ўзнаўлення Крыжа. Для навуковай дапамогі мастаку ЗБС стварыла Навукова-грамадскую раду ў складзе вядомых гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў і іншых спецыялістаў. Навуковым кіраўніком праекта быў зацверджаны доктар гістарычных навук, прызнаны даследчык гісторыі Полацкага княства Георгі Штыхаў.

Адначасова «Бацькаўшчына» звярнулася да грамадскасці як у Беларусі, так і ў замежжы з заклікам далучыцца да святой справы адраджэння вобраза нацыянальнай святыні і Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, дзе яна захоўвалася. Знайсці сродкі і далучыць да ўвасаблення выдатнай ідэі беларусаў з іншых краінаў дазволіла стварэнне Рады прадпрымальнікаў беларускай дыяспары. Значную частку сродкаў ад імя ЗБС «Бацькаўшчына» ўклалі ў праект Анатоль Сілівончык і Мікола Сулкоўскі з Расіі, Анатоль Лук'янчык з ЗША. Вялікія заслугі ў адраджэнні святыні маюць

старшыня праўлення СП «Міжнародны цэнтр прадпрымальнікаў беларускай дыяспары» Барыс Стук, першы старшыня Рады ЗБС Яўген Лецка, яго пераемніца на гэтай пасадзе Ганна Сурмач, прэзідэнт ЗБС Радзім Гарэцкі, многія сябры Рады Згуртавання, а таксама іншыя спрыяльнікі гэтай справы.

Майстар Мікола Кузьміч здзейсніў сапраўдны навуковы і творчы подзвіг, здолеўшы аднавіць унікальны твор і адначасова адрадзіць страчаную восем стагоддзяў назад тэхніку перагародкавай эмалі. Дзякуючы намаганням Царквы, новы Крыж мае ўсе тыя хрысціянскія рэліквіі, якія знаходзіліся ў яго старажытным правобразе. Беларусь атрымала не проста выдатны твор мастацтва, але, найперш, неацэнную сакральную каштоўнасць. Свой уклад ва ўзнаўленне рэліквіі ўнесла і дзяржава: ёю была выдзелена частка каштоўных металаў і каштоўныя камяні, арганізавана ахова мастака і майстэрні. Дзеля дакументальнага засведчання гісторыі аднаўлення Крыжа па заказу ЗБС «Бацькаўшчына» рэжысёр Віктар Шавялевіч зняў відэафільм, а пісьменнік і гісторык Уладзімір Арлоў падрыхтаваў да выдання прысвечаную гэтай тэме навукова-папулярную кнігу.

Такім чынам, працэс адраджэння вобраза Крыжа Еўфрасінні Полацкай быў не проста асабістай спробаю сучаснага майстра паўтарыць шлях свайго папярэдніка. Ад нараджэння ідэі і да яе ўвасаблення гэта была праца многіх людзей. Кожны з іх — сусветная беларуская грамадскасць, Царква, дзяржаўныя структуры, навуковыя колы і простыя беларускія людзі — унёс сваю долю. Мы зрабілі свой крок да ідэі Крыжа, як духоўнага сімвала нацыі. У ім наша пакаянне, надзея і любоў да Бога і сваёй Бацькаўшчыны — Беларусі. Спадзяемся, што гэта наблізіць час вяртання таго Крыжа, які трымала ў руках патронка зямлі Беларускай — святая Еўфрасіння.

Рада Згуртавання беларусаў свету выказвае сардэчную падзяку Беларускай праваслаўнай царкве і мітрапаліту Філарэту, усім, хто спрыяў адраджэнню вобраза Крыжа і вяртанню яго на месца, вызначанае некалі для святыні самой найпадобнейшай Еўфрасінняю. Адраджэнне святыні было адной з важнейшых праграмаў дзейнасці ЗБС «Бацькаўшчына». Разам з усімі ўдзельнікамі працэса аднаўлення вобраза Крыжа мы паспяхова завяршылі гэтую агульнанацыянальную справу, спрыяючы вяртанню беларусаў да Бога і спрадвечных маральных і нацыянальных каштоўнасцяў. ЗБС «Бацькаўшчына» ўзнагародзіла ўсіх удзельнікаў і спрыяльнікаў Ушанавальнымі граматамі Згуртавання і падарункамі. Беларускі экзархат са свайго боку таксама ўганараваў сяброў «Бацькаўшчыны»: Анатоля Сілівончыка — ордэнам святога роўнаапостальнага Уладзіміра, Ганну Сурмач і Барыса Стука — граматамі Патрыяршага экзарха.

Усе мы, каго аб'яднала ідэя адраджэння вобраза святыні, будзем і надалей выкарыстоўваць свой навуковы, творчы і інтэлектуальны патэнцыял, працуючы ў Згуртаванні беларусаў свету «Бацькаўшчына» і ўствораным у верасні 1997 года Міжнародным дабрачынным фондзе Жыватворнага Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай, галоўнай мэтай якога з'яўляецца спрыянне

адраджэнню духоўнасці і нацыянальнай культуры, як падмурка станаўлення сучаснай беларускай дзяржаўнасці, на падставе духоўных каштоўнасцяў, закладзеных найпадобнейшаю Еўфрасінняю ў ідэю Крыжа — духоўнага і аб'яднаўчага сімвала народа.

Заклікаем далучыцца да нашай працы беларусаў з Бацькаўшчыны і з замежжа.

Дзеля больш глыбокага шанавання імя Еўфрасінні і яе Крыжа Рада ЗБС звяртаецца да Урада краіны з прапановаю надаць Дню памяці нябеснай заступніцы Беларусі святой Еўфрасінні Полацкай (5 чэрвеня новага стылю) статус агульнадзяржаўнага свята.

Верым, што адроджаны Крыж будзе ўмацоўваць нашу веру, уваскрашаць памяць, яднаць нацыю і дапаможа нам пабудаваць свабодны і заможны Беларускі Дом.

Прынята на пасяджэнні Рады ЗБС «Бацькаўшчына»
5.12.1997 г.

ЗАЯВЛЕНИЕ
Рады Объединения белорусов мира «Бацькаўшчына» в связи с воссозданием образа Креста святой Евфросинии Полоцкой

Возвращение Беларуси ее национальных сокровищ является одним из главных направлений деятельности Объединения белорусов мира (ОБМ) «Бацькаўшчына». Особое место в этой работе занимает забота о судьбе созданного в 1161 году полоцким мастером Лазарем Богшей Креста святой Евфросинии — древнего символа святости и государственности нашей земли, утраченного в годы Второй мировой войны. Очевидно, что утрата Креста — это не материальная потеря. Крест покинул нас, ибо мы отошли от Божьих заветов, от святых обязанностей сохранять свой род, свою страну, ее культуру и язык — все то, что дано нам Всевышним.

Во время нового белорусского Возрождения начался наш путь возвращения к святыням. По милости Божьей и благодаря борьбе лучших сыновей Беларуси наш народ начал пробуждаться от исторического беспамятства. Именно тогда и возникла идея воссоздания образа исторической реликвии — Креста Евфросинии. В декабре 1992 года на Первом сходе белорусов близкого зарубежья было поддержано предложение о символическом возвращении святыни и создании Креста по образу и подобию Животворного Креста Евфросинии. Организатором Схода была общественная организация — Объединение белорусов мира «Бацькаўшчына». Именно «Бацькаўшчына» и взяла на себя благородную и непростую обязанность выполнить волю белорусской громады. Ответственным за это дело был назначен

предприниматель белорусского происхождения из России (Сургут) Анатолий Силивончик.

Выполнение этого чрезвычайно ответственного и сложного заказа «Бацькаўшчына» поручила известному белорусскому художнику-ювелиру Миколе Кузьмичу. Начатая работа получила благословение митрополита Минского и Слуцкого, Патриаршего экзарха всея Беларуси Филарета. Белорусский экзархат взял на себя духовную опеку над делом воссоздания Креста. Для научной помощи художнику ОБМ создало Научно-общественный совет в составе известных историков, искусствоведов и других специалистов. Научным руководителем проекта был утвержден доктор исторических наук, признанный исследователь истории Полоцкого княжества Георгий Штыхов.

Одновременно «Бацькаўшчына» обратилась к общественности как в Беларуси, так и за рубежом с призывом подключиться к святому делу возрождения образа национальной святыни и Полоцкого Спасо-Евфросиниевского монастыря, где она хранилась. Найти средства и привлечь к воплощению прекрасной идеи белорусов из других стран позволило создание Рады предпринимателей белорусской диаспоры. Значительную часть средств от имени ОБМ «Бацькаўшчына» вложили в проект Анатолий Силивончик и Микола Сулковский из России, Анатолий Лукьянчик из США. Большие заслуги в возрождении святыни принадлежат председателю правления СП «Международный центр предпринимателей белорусской диаспоры» Борису Стуку, первому председателю Рады ОБМ Евгену Лецку, его преемнице на этой должности Ганне Сурмач, президенту ОБМ Радиму Горецкому, многим членам Рады Объединения, а также другим участникам этого дела.

Мастер Микола Кузьмич совершил подлинный научный и творческий подвиг, сумев восстановить уникальное произведение и одновременно возродить утраченную восемь веков назад технику перегородчатой эмали. Благодаря усилиям Церкви, новый Крест включает в себя все те христианские реликвии, которые находились в его древнем прообразе. Беларусь получила не просто выдающееся произведение искусства, но, прежде всего, бесценное сакральное сокровище. Свой вклад в воссоздание реликвии внесло и государство: им была выделена часть драгоценных металлов и драгоценные камни, организована охрана художника и мастерской. Для документального свидетельства истории воссоздания Креста по заказу ОБМ «Бацькаўшчына» режиссер Виктор Шевелевич снял видеофильм, а писатель и историк Владимир Орлов подготовил к изданию посвященную этой теме научно-популярную книгу.

Таким образом, процесс возрождения образа Креста Евфросинии Полоцкой был не просто личной попыткой современного мастера повторить путь своего предшественника. От рождения идеи и до ее воплощения это был труд многих людей. Каждый из них — мировая белорусская общественность, Церковь, государственные структуры, научные круги и простые белорусские люди — внес свою лепту. Мы сделали свой шаг к идее Креста,

как духовного символа нации. В нем наше покаяние, надежда и любовь к Богу и к своей Родине — Беларуси. Надеемся, что это приблизит время возвращения того Креста, который держала в руках патронесса земли Белорусской — святая Евфросиния.

Рада Объединения белорусов мира выражает сердечную благодарность Белорусской православной церкви и митрополиту Филарету, всем, кто содействовал возрождению образа Креста и возвращению его на место, определенное некогда для святыни самой преподобной Евфросинией. Возрождение святыни было одной из важнейших программ деятельности ОБМ «Бацькаўшчына». Вместе со всеми участниками процесса воссоздания образа Креста мы успешно завершили общенациональное дело, содействуя возвращению белорусов к Богу и извечным нравственным и национальным ценностям. ОБМ «Бацькаўшчына» вручила всем участникам награды: Почетные грамоты Объединения и подарки. Белорусский экзархат со своей стороны также наградил членов «Бацькаўшчыны»: Анатолия Силивончика — орденом святого равноапостольного Владимира, Ганну Сурмач и Бориса Стука — грамотами Патриаршего экзарха.

Все мы, кого объединила идея возрождения образа святыни, будем и впредь использовать свой научный, творческий и интеллектуальный потенциал, работая в Объединении белорусов мира «Бацькаўшчына» и в созданном в сентябре 1997 года Международном благотворительном фонде Животворного Креста святой Евфросинии Полоцкой, главной целью которого является содействие возрождению духовности и национальной культуры, как фундамента становления современной белорусской государственности, на основе духовных ценностей, заложенных преподобной Евфросинией в идею Креста — духовного и объединительного символа народа.

Призываем присоединиться к нашей работе белорусов на Родине и за рубежом.

С целью более глубокого почитания имени Евфросинии и ее Креста Рада ОБМ обращается к Правительству страны с предложением придать Дню памяти небесной покровительницы Беларуси святой Евфросинии Полоцкой (5 июня нового стиля) статус общегосударственного праздника.

Верим, что возрожденный Крест будет укреплять нашу веру, воскрешать память, объединять нацию и поможет нам построить свободный и зажиточный Белорусский Дом.

Принято на заседании Рады ОБМ «Бацькаўшчына»
5.12.1997 г.

СПІС
на ўзнагароджанне Граматамі Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», кнігамі і каштоўнымі падарункамі за непасрэдны ўдзел у аднаўленні вобраза Крыжа св. Еўфрасінні Полацкай

Кузьміч Мікола — мастак, аўтар аднаўлення вобраза Крыжа

Шыхаў Георгі — доктар гістарычных навук, навуковы кіраўнік праекта, старшыня Навукова-грамадскай рады

Уладыка Філарэт — Патрыяршы экзарх усяе Беларусі

Сілівончык Анатоль — галоўны фундатар праекта (Расія, г. Сургут)

Сілівончык Настасся — жыхарка вёскі Гамза Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці

Сулкоўскі Мікола — фундатар праекта (Расія, г. Новасібірск)

Лук'янчык Анатоль — фундатар праекта (ЗША, г. Кліўленд)

Арлоў Уладзімір — пісьменнік

Шавялевіч Віктар — кінарэжысёр, аўтар фільма пра аднаўленне Крыжа

Гарэцкі Радзім — прэзідэнт ЗБС «Бацькаўшчына»

Стук Барыс — старшыня праўлення СП «Міжнародны цэнтр прадпрымальнікаў беларускай дыяспары», намеснік старшыні Рады ЗБС «Бацькаўшчына»

Сурмач Ганна — старшыня Рады ЗБС «Бацькаўшчына»

Лецка Яўген — сябра Рады ЗБС, былы старшыня Рады

Мальдзіс Адам — дырэктар Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны, сябра Рады ЗБС

Скрыпчанка Таццяна — навуковец, спецыяліст па эмалях

Макарава Таццяна — доктар гістарычных навук (г. Масква)

Аляксееў Леанід — доктар гістарычных навук (г. Масква)

Бубноўскі Дзмітры — старшыня Камітэта па ахове гісторыка-культурнай спадчыны

Рылатка Уладзімір — намеснік міністра культуры

Антонава Таццяна — журналіст газеты «Звязда»

Думчык Анатоль — рэстаўратар Беларускага экзархату

Петрашкевіч Андрэй — супрацоўнік Беларускага экзархату

Сацюк Міхаіл — святар (г. Брэст)

Грудніцкі Іаан — святар (г. Брэст)

Купрыенка Уладзімір — намеснік старшыні Дзяржтэлерадыё

Халява Браніслаў,
Пацеявец Васіль,
Бань Міхаіл,
Мароз Валеры,
Якімук Сяргей — супрацоўнікі Брэсцкага ўпраўлення Камітэта дзяржбяспекі, якія ажыццяўлялі ахову майстэрні М. Кузьміча
Якавук Віталь — памочнік майстра Міколы Кузьміча
Макоўская Алена — загадчык аддзела СП «Міжнародны цэнтр прадпрымальнікаў беларускай дыяспары»

Зацверджаны на пасяджэнні Малой Рады
Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына»
5.12.1997.

СПІС
на ўзнагароджанне Граматамі Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» і кнігамі пра Еўфрасінню Полацкую
за спрыянне ў аднаўленні вобраза
Крыжа святой Еўфрасінні

Сябры Управы ЗБС «Бацькаўшчына»:
Сабалеўскі Анатоль
Адамовіч Яўген
Савік Лідзія
Загорская Ніна
Саверчанка Іван
Кароль Аляксей
Герасімаў Валеры
Ліс Арсень
Мархель Таццяна
Казыра Лявон
Тарасаў Сяргей — гісторык
Высоцкая Надзея — навуковец
Хадыка Юры — навуковец
Шматаў Віктар — мастацтвазнаўца
Касцюк Міхась — дырэктар Інстытута гісторыі АН РБ
Загрышаў Іван — дырэктар Нацыянальнага музея Беларусі

Краўчанка Пётр — дзяржаўны і грамадскі дзеяч

Коўтун Валянціна — пісьменніца, старшыня Міжнароднага жаночага фонду св. Еўфрасінні Полацкай

Хоміч Міхась — юрыст (г. Брэст)

Пухоўскі Уладзімір — навуковец

Кулік Яўген — мастак

Іпатава Вольга — пісьменніца

Жыльскі Аляксей — былы старшыня Савета па справах рэлігіі пры СМ РБ

Шыркоўскі Эдуард — былы старшыня Камітэта дзяржбяспекі РБ (за арганізацыю аховы майстэрні мастака М. Кузьміча)

Зацверджаны на пасяджэнні Малой Рады
Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына»
5.12.1997.

KAMUNIKAT.org